# Птушкі і гнезды, альбо Чаму лысуха не ходзіць гогалем.

Хай не здзіўляе нашых чытачоў тое, што вясною мы расказваем пра зімовы ўлік водна-балотных птушак. Зараз якраз апрацоўваюцца сабраныя даныя гэтай надзвычай важнай акцыі. Значыць, можам ужо сказаць пра папярэднія вынікі, даведацца, ці ўтульна ў Беларусі розным птушкам.

Мерапрыемства праводзіла грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ). Чаму менавіта ўзімку? З такім пытаннем я звярнуўся да Руслана Шайкіна, спецыяліста па экалагічнай адукацыі АПБ.

— Справа ў тым, што ўзімку птушак менш, яны збіраюцца чародамі. Прылятаюць на кармушкі, якія падрыхтавалі ім клапатлівыя людзі, альбо трымаюцца на невялікіх участках вадаёмаў. Таму вельмі прыкметныя, іх лёгка пералічыць, — адзначае ён.

Якія ж важныя даныя з жыцця гэтых насельнікаў нашых азёр, рэк, балот атрыманы?

На ўлік узяты амаль 53 тысячы зімуючых водна-балотных птушак. Яны адносяцца да 37 відаў. З найбольш масавых, якія зімуюць у нас, наступныя: краква — 43 084 рэгістрацыі, лебедзь-шыпун — 3458, звычайны гогаль — 1900, вялікі крохаль — 1830, лысуха — 1300 рэгістрацый. Пра што сведчаць гэтыя лічбы?

Да пачатку XX стагоддзя лебедзь-шыпун, да прыкладу, рэгулярна гнездаваўся на азёрах Беларусі, Польшчы і Літвы.

А што цяпер з лебедзем-шыпуном? —

Яго рэальная колькасць у рэспубліцы каля 2 тысяч, — гаворыць арнітолаг Іван Багдановіч. — Вельмі вялікая лічба. Некаторым птушкам, відаць, падабаецца Беларусь, яе утульныя мясціны. Скажам, звычайнаму гогалю. Вельмі цікавая птушка. Па-першае, гняздуецца ў дуплах дрэў, па-другое, зімуе ў Заходняй Еўропе. Раней яе колькасць у Беларусі была меншай. Зараз павялічылася.

Амаль у аднолькавай сітуацыі з гогалем апынуўся сёлета крохаль вялікі: 1830 рэгістрацый. Птушка з багатым апярэннем. Галава і верхняя частка шыі бліскуча-чорныя з зялёным адлівам, дзюба чырвоная, спіна чорная, ніз цела белы. Здаецца, усё яе жыццё — нейкая ўрачыстасць.

А вось лысухі ў параўнанні з іншымі відамі ў сёлетнюю зімоўку стала менш, і невядома чаму. А птушка цікавая. У Беларусі ёй жывецца добра, бо тут шмат азёр, заток, старыц, балот… Гнёзды ладзіць каля самай вады, там, дзе на берагах густыя зараснікі трыснягу, рагозу, асакі.

— Новыя буйныя зімоўкі водна-балотных птушак выяўлены ў Мазыры, Салігорску, Слуцку, — працягвае Іван Багдановіч. — Сёлета на ачышчальных збудаваннях паміж Калінкавічамі і Мазыром сабралася вялікая групоўка качак, прычым шмат іх аблюбавалі ўчастак набярэжнай Прыпяці. Не скаваў мароз ачышчальныя збудаванні каля Салігорска — і птушкі спакойна тут зімавалі. Каля Мінска было адзначана аж 7735 рэгістрацый розных птушак. На Лукомльскім возеры — 3414 рэгістрацый. Тут заўважаны нават паўночныя качкі — турпан і сіньга, якія на тэрыторыі Беларусі рэдкія госці. У Гродна — каля 3000 рэгістрацый, у Барысаве — 1553. Як правіла, зімавалі птушкі там, дзе цёплая вада

— Іван Аляксандравіч, вы апрацуеце даныя, атрыманыя ў час зімовага ўліку птушак, а што далей?

— Будзем друкаваць іх у навуковых выданнях. Гэта ж матэрыял, якому проста цаны няма. Дбайна сабраныя звесткі пра гэтых насельнікаў у розных кутках Беларусі вельмі дапамагаюць вучоным пры глыбокіх і сур’ёзных даследаваннях.

Зараз вясна, птушкам куды лепш. Але ж клапаціцца пра іх неабходна і ў гэтую пару года. Яны сядзяць на гнёздах, выводзяць бездапаможных птушанят. Значыць, ім асабліва патрэбны спакой і цішыня. Людзі выязджаюць у выхадныя ў лес, да азёр і рэк. І, на жаль, далёка не ўсе ўважліва адносяцца да птушак. А яны ж — адметнасць беларускай зямлі.

Тыя мерапрыемствы, якія ладзіць АПБ, сведчаць: птушкам утульна ў Беларусі.

Ад нас усіх залежыць, каб было так і надалей.

**Источник:** Рэсп.-2009.-14 мая.-С.6.